Жыві і цэльнасці шукай, аб шыраце духоўнай дбай...

М. Багдановіч

СТУДЭНЦКАЯ ГАЗЕТА
БДУКМ

# ALMA papera

Спецвыпуск
№7 (50)
лістапад 2013

Выдаецца з сакавіка 2005



## *Справа НАСТАЎНІКА жыве ў вучнях*

**Дробыш Станіслаў Іосіфавіч**

**(17.03.1939 г. - 31.10.2013 г.)**

31 кастрычніка на 75 годзе пайшоў з жыцця Станіслаў Іосіфавіч Дробыш, вядомы ў рэспубліцы хормайстар, педагог і прапагандыст народна-харавога мастацтва, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, прафесар, загадчык кафедры УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

Станіслаў Іосіфавіч нарадзіўся 17 сакавіка 1939 года ў в. Заграддзе Слуцкага раёна Мінскай вобласці. У сваім жыцці быў пытлівы да ведаў: скончыў Інстытут народнай гаспадаркі, Музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі, Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В.Луначарскага.

З 1977 года да апошняга часу працаваў ва ўніверсітэце, а з 1981 года – нязменны загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці.

У 1979 годзе ставарае вакальна- харэаграфічны ансамбль "Валачобнікі", які стаў сапраўднай майстэрняй па вывучэнні і прапагандзе беларускага фальклору. Аўтар шматлікіх канцэртных праграм, вакальна-харэаграфічных пастановак.

Прафесар Дробыш Станіслаў Іосіфавіч выхаваў вялікую плеяду вучняў, якія працягваюць яго справу. Гэта вядомыя артысты, кіраўнікі творчых калектываў, грамадскія дзеячы.

За педагагічную, грамадскую і вялікую творчую дзейнасць неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, ганаровым знакам Міністэрства культуры СССР, ганаровым знакам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. За ўклад у выхаванне творчай моладзі ў 1998 годзе атрымаў прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дробыш Станіслаў Іосіфавіч з'яўляўся членам камісіі Міністэрства культуры па прысваенні званняў "Народны", "Заслужаны" аматарскім калектывам; членам камісіі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі па прысваенні прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці; членам журы гарадскіх і рэспубліканскіх фестываляў народнай творчасці, членам Экспертнай камісіі Фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па прызначэнні стыпендый і грантаў таленавітай моладзі.

РЭПОЗІТОРЫЙ БДУКМ

# З ПЕСНЯЙ ПРАЗ ЖЫЦЦЁ

*Вытрымкі з інтэрв'ю. Верасень 2009 г.*



Першае прызнанне працы гэтага Вялікага Чалавека са Случчыны і яго ўклад у развіццё культуры Беларусі прыпала на 70-80-я гады мінулага стагоддзя. Менавіта тады ён атрымаў сваю першую вялікую ўзнагароду — званне заслужанага работніка культуры. Пасля было яшчэ шмат узнагарод і асабістых перамог. Кабінет напаўняўся дыпломамі, ганаровымі граматамі і падарункамі з конкурсаў і фестываляў. І вось у сакавіку 2009 года ён адзначыў свой 70-гадовы юбілей. Але гутарка зараз вядзецца не проста пра чалавека, а пра чалавека ў мастацтве, для мастацтва і ў імя мастацтва.

Станіслаў Іосіфавіч Дробыш — выкладчык, кіраўнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, загадчык кафедры, музыка і дырыжор, таленавітая і шматгранная асоба.

**Якім было Ваша дзяцінства, і з чаго ўсё пачыналася?**

**С.І. Дробыш:** Мая маці — Ніна Іосіфаўна, яна расціла нас з сястрой Ларысай адна, бо бацька Іосіф Андрэевіч загінуў у Вялікай Айчыннай вайне. Мы спазналі і галоту, і нястачы, аднак маці вельмі старалася выхаваць з нас годных і адукаваных людзей. Наша вёска была вельмі маленькая, амаль што ў некалькі двароў, сваёй школы не было, і маці адправіла нас вучыцца за дзесяць кіламетраў ва Урэчскую сярэднюю школу. І так кожную раніцу, дзе пехатой, а дзе і на "папутных" аўтамабілях, мы дабіраліся на вучобу. Калі я скончаў 10-ты клас, Ларыса ўжо вучылася ў мінскім інстытуце. Увогуле яна была першая з вёскі, хто атрымліваў вышэйшую адукацыю. Вось і ў мяне расло і мацнела жаданне таксама паступіць у ВНУ. І ўжо тады я марыў звязаць сваё жыццё са спевамі, бо гэта ў мяне вельмі добра атрымлівалася. Візітнай карткай было выкананне перад мясцовымі слухачамі рускай народнай песні "Когда я на почте служил ямщиком". Ларыса таксама прывозіла з горада новыя песні, якія мы з вялікай асалодай завучвалі і спявалі. Аднойчы разам з новым рэпертуарам сястра прывезла і правілы паступлення ў музычнае вучылішча ў Мінску. Усё было б нічога, калі б не гэтае страшнае слова "сальфеджыо". Што гэта, як гэта і з чым яго можна есці, я не ведаў, ды і не мог ведаць, бо музычнай школы не было не тое што ў Заграддзі, але і ў навакольных вёсках і гарадскіх пасёлках. Таму ад мары аб "Глінкінскім" вучылішчы мне прыйшлося адмовіцца.

**Але Вы ўсё ж паехалі ў Мінск паступаць у ВНУ?**

**С.І. Дробыш:** Так. Я паехаў і выдатна здаў іспыты ў Мінскі інстытут народнай гаспадаркі. Скончыў я яго па спецыяльнасці бухгалтар-эканаміст. Падчас вучобы я спяваў у народным хоры Палаца Прафсаюзаў. Дзесьці ў душы не давала спакою думка пра нязздзейсненую мару і цеплілася надзея, што многае наперадзе і ёсць магчымасць усё перайначыць. І няхай гэта не будзе прафесійная сцэна, але ж я буду ў мастацтве.

Скончыўшы інстытут, я быў размеркаваны на Мінскі аўтамабільны завод, дзе і працаваў па спецыяльнасці. У той жа час удзельнічаў у Народным тэатры. Аднойчы на адным з конкурсаў-праглядаў самадзейных тэатральных калектываў мяне заўважыў Платонаў, які сядзеў у журы, і запрасіў у Драматычна тэатр імя Янкі Купалы ў якасці акцёра. Гэта была яшчэ адна лесвічная прыступка, якая аддаляла мяне ад маёй "эканамічна-бухгалтарскай" сучаснасці і набліжала да будучыні ў мастацтве.

І ў гэты ж час я арганізаваў хор мужчынскага інтэрната №1 аўтамабільнага завода. Гэта была першая дарослая спроба арганізаваць мастацкі калектыў. Узгадваеш, бывае, усе цяжкасці, з якімі прыйшлося сутыкнуцца на гэтым этапе, і за галаву хапаешся. Адзін толькі набор удзельнікаў чаго каштаваў. Некаторыя таксама, як я, пачыналі хварэць гэтай справай, а іншым прыходзілася даводзіць на ўласным прыкладзе, што ў гэтай задумы ёсць сэнс. Нягледзячы на перашкоды і цяжкасці, хор я стварыў. Адукацыі ж музычнай не было, вось махаў рукамі перад спевакамі як умеў, як адчуваў, гэтак жа і на галасы раскладваў. Атрымлівалася няблага.

**А як далей складалася Ваша жыццё?**

**С.І. Дробыш:** Ніколі не пакідала адчуванне таго, што я чалавек, якому яшчэ выпадзе здзейсніць задуманае некалі тады, у юнацтве. Адзінае, шт засмучала, — мая музычная няграматнасць. Але пераломным момантам стала выпадковая сустрэча з кампазітарам Алоўнікавым, якому я ўдзячны і па сённяшні дзень. Ён параіў мне ісці вучыцца і не звяртаць увагі ні на што. Гэта былі моцныя словы, якія дадалі мне ўпэўненасці ў сабе і той справе, якой я збіраўся прысвяціць сваё жыццё. І я паступіў. Адукацыю я спачатку атрымаў ў Музычным вучылішчы імя М.Глінкі, а потым паспяхова скончыў кансерваторыю па класе харавога дырыжыравання. Менавіта тады пачалася мая плённая музычная праца. У 1964 годзе я быў запрошаны кіраўніком народнага хора ў Дом культуры будаўнічаг треста №5. Гэта быў пачатак маёй паспяховай прафесійнай дзейнасці. Калектыў, якім я кіраваў, кожны год станавіўся лаўрэатам конкурсаў-праглядаў. Нічога не давалася проста так. Я адчуваў, што знаходжуся на сваім месцы, там, дзе я не проста працую, а прыношу карысць і дапамагаю развіццю беларускага музычна-песеннага мастацтва. Менавіта падчас кіраўніцтва гэтым хорам я і атрымаў званне заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

**Аднак асноўная праца, праца жыцця, пачалася пазней, у сценах сучаснага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

**С.І. Дробыш:** У той час гэтая ўстанова яшчэ так не называлася і нават не насіла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статус універсітэта. У 1977 годзе кіраўніцтва Інстытута культуры вырашыла стварыць новую спецыяльнасць “народна-харавыя спевы”, і мяне, у той час ужо дастаткова вядомага дзеяча мастацтваў, запрасілі на працу. Гэта быў прынцыпова новы крок для інстытута ўвогуле, бо навучанне было ўсё прасякнута “акадэмізмам”, а народнае выкананне лічылася малапрафесійным, аматарскім. А тут прынята рашэнне аб прафесійным навучанні спевакоў у народнай манеры! Штосьці накшталт маленькай перабудовы ў мастацтве. З гэтай нагоды ў 1981 годзе была створана кафедра.

**А як з’явілася ідэя “Валачобнікаў”?**

**С.І. Дробыш:** У 1979 годзе на нашай кафедры быў створаны амаль што першы ў інстытуце вучэбны калектыў, тады ён не насіў назвы “Валачобнікі”. У той час маладых спецыялістаў адпраўлялі на стажыроўкі. Адправілі і мяне ў Маскоўскі інстытут культуры імя Гнесіных. На базе гэтага інстытута працаваў вакальна-харэаграфічны ансамбль “Карагод” пад кіраўніцтвам Засімава. Гэты калектыў так уразіў мяне, што я палічыў за злачынства не стварыць нешта падобнае ў Мінску. Прыехаўшы, я так і зрабіў. Мы сталі працаваць на беларускім рэпертуары, які знаходзілі ў фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях, якія ладзіліся на сродкі інстытута. Такім чынам, рэпертуар узбагачаўся матэрыялам з усёй Беларусі. У сценах інстытута загучала вясёлая беларуская песня і тут жа звярнула на сябе ўвагу. Мы сталі сапраўднымі наватарамі. Зусім выпадкова мы вырашылі спец адну з “адкапаных” валачобных песень. Выкананне прайшло на “ўра”, і было вырашана назвацца “Валачобнікамі”. Гэта быў пачатак, старт 30-гадовага існавання калектыву. А далей усё пайшло як мае быць. Мы сталі працаваць над песнямі, ставіць танцы, распрацоўваць аркестровы рэпертуар. “Валачобнікі” былі ўнікальным калектывам, бо аналагаў на той час не існавала ўвогуле па краіне. Мы былі першыя, хто стаў папулярызаваць народнае відовішча — а менавіта так і можна назваць канцэртныя праграмы ансамбля — сярод звычайных слухачоў і гледачоў, а таксама натхняць прафесіяналаў на стварэнне нечага падобнага, яшчэ не бачанага на беларускай сцэне. А маім асабістым гонарам з’яўляецца тое, што за ўсе 30 год выкарыстоўваўся толькі беларускамоўны рэпертуар, хаця шмат было і нараканняў і меркаванняў пра сэнс такой прынцыповасці. Але ж мы настаялі на сваім і прымусілі ўпэўніцца і аматараў, і прафесіяналаў у тым, што беларускае можа быць цікавым, яно ўражвае і здзіўляе, радуе і захапляе, можа быць і высокім мастацтвам, і мастацтвам для кожнага.



**Валентин Бернацкий**

солист ансамбля «Валачобнікі», председатель студенческого совета ФМИ

*Говорят нет незаменимых людей...Это ложь! Заместить можно должность, статус, но человека, которым был Станислав Иосифович, невозможно. Красной нитью через его жизнь проходила любовь – к людям, семье, творчеству, работе и к главному делу всей жизни – ансамблю «Валачобнікі». Только он умел из простейшей мелодии сделать полноценный многоголосный номер с яркой драматургией и особым настроением. Он сочетал в себе тонкого психолога, чувствующего настроение студента и желания зрителей, режиссера, который из нескольких песен мог сделать фееричный спектакль, преподавателя многих музыкальных дисциплин и учителя жизни.*

*Разве можно заменить душу? Нет! Мы, «Валачобнікі», сделаем все, что в наших силах, чтобы продолжить дело и сохранить память о нашем творческом отце навсегда.*



**Екатерина Шиш**

солистка ансамбля «Валачобнікі»

*31 октября страшная новость облетела всех тех, для кого «Валачобнікі» имеют значение. Сердце коллектива перестало биться... Невозможно описать, каким было потрясение. Горечь утраты не унять. В тот день мы о многом вспоминали: о том, каким был Станислав Иосифович, о методах его работы, о курьезных случаях... Я бесконечно рада, что мне удалось прикоснуться к гению этого человека. Но времени оказалось мало, столько не сделано, столько не сказано...*

*И как бы не было трудно, мы сделаем все возможное, чтобы дело всей его жизни не пропало. Искра, которую зажег в нас кропотливый труд Станислава Иосифовича, искра любви к народному творчеству, не погаснет.*



**Максим Лайша, выпускник БГУКИ**

*Станислав Иосифович выдающийся человек. Он открыл мне новое видение народной песни, народного искусства. Я горжусь тем, что мне посчастливилось слышать его, видеть его, быть его учеником. Я уверен, что детище Станислава Иосифовича будет жить, а его ученики, воспитанники, все его дети сделают для этого всё..*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НА НІВЕ МАСТАЦТВА — больш за 30 год

Вакальна-харэаграфічны ансамбль "Валачобнікі" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў заснаваны ў 1979 г. прафесарам, заслужаным работнікам культуры Рэспублікі Беларусь Станіславам Іосіфавічам Дробышам. Калектыў неаднаразова станавіўся візітнай карткай Беларусі на міжнародных конкурсах і фестывалях у Нідэрландах, Германіі, Эстоніі, Францыі, ЗША, Расіі, Польшчы, Балгарыі, Іспаніі. Ансамбль з годнасцю нясе сцяг нашай краіны. Ён з'яўляецца лаўрэатам Міжнароднага фальклорнага фестываля "Пернік" у Балгарыі, 10-га Міжнароднага Гуцульскага фальклорна-этнаграфічнага фестываля "Коломийка", 10-га Міжнароднага фестываля народных традыцый у Італіі, Міжнароднага фестываля традыцыйных культур у Нідэрландах і Бельгіі, Міжнароднага фестывалю фальклорных калектываў у Германіі. Спіс творчых перамог і культурных здабыткаў калектыва амаль нескончальны. Гэта вынік плённай працы як кіраўніка, так і выкладчыкаў, якія працуюць на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўніверсітэта.



Калектыў складаюць студэнты факультэта музычнага мастацтва. Гэта і спевакі, і музыкі, і таленавітыя танцоры. За 34 гады "Валачобнікі" выхавалі безліч талентаў, якія і зараз працуюць на творчай глебе ў прафесійных і аматарскіх калектывах па ўсёй краіне. Калектыў — гэта лабараторыя, дзе за 5 гадоў навучання неапрацаваныя камякі гліны пераўтвараюцца ў мастацкі цуд тонкай ручной працы. І гэта не проста прыгожая метафара, бо тут, у навучальных класах, атрымалі свой квіток на вялікую сцэну Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Наталля Раманская, саліст ансамбля народнай музыкі "Бяседа" Белтэлерадыёкампаніі Валянцін Кірыленка, салістка ансамбля народнай музыкі "Свята" Людміла Кірыленка, артыстка Дзяржаўнага Акадэмічнага Народнага хору імя Цітовіча Наталля Конюх, Заслужаны дзеяч мастацтваў Валянціна Гладкая, знакаміты музыкант, лідэр этна-трыо "Троіца" Іван Кірчук, мастацкі кіраўнік узорнага ансамбля песні і танца "Зорачка" Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Мінска Ала Навіцкая і іншыя выбітныя постаці.



Нягледзячы на свой "вучэбны" статус, "Валачобнікі" даюць больш за 50 канцэртаў у год. Няма амаль што ніводнай пляцоўкі ва ўсёй краіне, дзе б нашы студэнты не спявалі і не танчылі. Яны прымалі ўдзел у дабрачынных акцыях "Чарнобыльскі шлях", станавіліся ўдзельнікамі канцэртаў для дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі ў Аксакаўшчыне, для інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Без удзелу ансамбля не адбываецца ніводнага свята ў рэспубліцы, іх бадзёрыя песні і танцы гучаць там, дзе існуе патрэба ў мастацтве: у гарадах і вёсках, дамах і кватэрах, у людскіх сэрцах і душах.



За гэты час створана, падрыхтавана і якасна выканана каля 25-ці канцэртных праграм. Сярод іх асноўныя абрады і святы беларускага земляробчага і сямейна-бытавога календара: "Гуканне вясны", "Валачобніцкія забавы", "Купалле", "Жніво", "Талака", "Каляды", "Імяніны", "Вяселле", "Вытокі" і іншыя. Кожная з праграм насычана вобразнасцю, шматколернасцю, музычнай і мастацкай асаблівасцю.

І вось за плячыма трыццаць чатыры гады калектыва, у якога тады, у самым пачатку творчай дзейнасці, не было аналагаў на Беларусі. Яны былі першыя, хто звязаў у адно гарэзлівы рух танца, харавство непаўторных самабытных песен і віртуозную ігру на музычных інструментах у адно дзейства, якое заварожвала і прымушала спыніцца, здзівіцца і не страчваць гэтага ўражання яшчэ доўгі час. Асаблівым гонарам з'яўляецца тое, што, нягледзячы на цяжкасці і выпрабаванні, усе 34 гады ансамбль працаваў толькі з беларускім рэпертуарам. Ладзіліся экспедыцыі, падчас якіх збіраліся песні з усёй краіны. Змяняўся час і разам з ім "Валачобнікі": сучасныя непаўторныя апрацоўкі, змяшэнне стыляў, наватарскія ідэі — выкарыстоўваліся самыя разнастайныя сродкі дзеля таго, каб не адстаць, застацца цікавымі і непаўторнымі. І гэта справа не аматарская, гэта паказчык прафесійнасці.

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Рабкораўская,17, каб. 230
220007, г. Мінск
тэл. (017) 256 06 20
**Адказны за выпуск**
Галіна Амплеенкава

БДУКМ.Зак.260.Тыр.100 экз. 08.11.2013г.
Лічбавы друк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ